АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРКІ ЖЫХАРОЎ В. ДЗЁРНАВІЧЫ ВЕРХНЯДЗВІНСКАГА РАЁНА

Н.П. Даўбешка
Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

Напрыканцы 2012 года выйшла з друку першая частка “Рэгіянальнага слоўніка Віцебшчыны” – выдання, якое адлюстроўвае “дыялектныя асаблівасці Падзвіння, словаўтваральныя магчымасці і вобразнасць народнай мовы” [1, 5]. У ім сабраны матэрыялы з усіх раёнаў Віцебшчыны, у тым ліку гэта 38 населеных пунктаў Верхнядзвінскага раёна, сярод якіх ёсць вёска Дзёрнавічы. Яна знаходзіцца на паўднёвым усходзе Верхнядзвінскага раёна, на яго мяжы з Полацкім раёнам, адміністрацыйны цэнтр Дзёрнавіцкага сельскага савета. На картах Вялікага Княства Літоўскага ўпершыню адзначана ў XVI стагоддзі. Зараз вёска налічвае 145 двароў, дзе пражывае каля 400 чалавек.

Мэта даследавання – прааналізаваць асаблівасці маўлення жыхароў вёскі Дзёрнавічы. Актуальнасць даследавання абумоўліваецца неабходнасцю далейшага глыбокага вывучэння гаворак поўначы Беларусі.

Вынікі і іх абмеркаванне. Гаворка жыхароў вёскі вызначаецца комплексам адметных асаблівасцей, уласцівых полацкім гаворкам паўночна-ўсходняга дыялекту. У прыватнасці, пад націскам у словах тут вымаўляюцца шэсць галосных – *[а], [о], [е], [ы], [і], [у]*: *хата, дарожный, адз’ежа, грыбы, ваз’іц’, куртка*. Для ненаціскных складоў характэрна дысімілятыўнае аканне і яканне. Пры дысімілятыўным аканні ў першым складзе перад націскам у словах з любым націскным галосным, акрамя *[а]*, гук *[а]* вымаўляецца вельмі выразна: *шапчу, травой, ваду, работа, марозный, кантора, чарн’іка, крас’івый, падуц’, варыц’, гарэц’* і інш. Калі ж пад націскам знаходзіцца галосны гук *[а*], тады ў гэтым становішчы ў словах вымаўляецца невыразны рэдукаваны *[ъ]*: *тръва, въда, кръваць, къмар, гърачый, пръдац’, шъптац’* і інш. Гук *[ъ]* гучыць і ва ўсіх іншых перад- і паслянаціскных складах, акрамя канцавога адкрытага складу. Параўн.: *мълако, гъварыў, бърьда, сывъртка, пръдавала, прыгъръдный*.

Асаблівасцю дысімілятыўнага якання ў гаворцы жыхароў вёскі з’яўляецца тое, што ў першым складзе перад націскным *[а]* (а ў некаторых словах – і перад націскным *[е]*) папярэдні галосны *[а]* вымаўляецца невыразна – як *[і] або [ь]*: *в’існа, с’істра, с’ідз’ець, л’іжац’, м’іне, ц’ібе, ц’іп’ер (в’ьсна, с’ьстра, с’ьдз’ец’, л’ьжац’)*; але *в’асной, с’астры, с’аджу, л’ажу*. Гэтыя ж гукі чуюцца і ў другім і наступным складах перад націскам, а таксама ў складах пасля націску: *з’іл’ан’ец’, вос’ін’, в’ец’ір, в’іл’ікъватый (з’ьл’ан’ец’, вос’ьн’, в’ец’ьр, в’ьл’ікъватый)* і інш.

Адной з істотных рыс у сістэме зычных з’яўляецца падаўжэнне мяккіх *[з’], [с’], [дз’], [ц’], [л’], [н’]* і цвёрдых *[ж], [ч], [ш]*: *свац’ц’а, с’в’ін’н’а, граз’з’у, ноччу, Іл’л’а, ц’іл’аччы* і інш. Прыстаўныя зычныя ў маўленні перадаюцца непаслядоўна. Параўн.: *вос’ін’, воз’іра, вушак, вуха, вокны, вугъл, вул’іца, вужака, гэта – ал’ха, оччым, оддых, опыт*. Гук *[р]* у вымаўленні паслядоўна цвёрды: *рыба, раб’іна, рэзъц’, рэчка*.

Пэўныя асаблівасці характарызуюць дадзеную гаворку і ў галіне марфалогіі. Так, напрыклад, назоўнік *печань* мае форму мужчынскага і жаночага роду: *бал’ны п’ечан’* і *бъл’найя п’ечан’*, паралельна ўжываюцца форма мужчынскага роду *пъхарон* ‘пахаванне’ і формы множнага ліку *похърьны, пъхароны*: *пайду на пахарон* і *пайду на похараны (пахароны)*. У скланенні назоўнікаў звяртаюць на сябе ўвагу давальны і месны склон. Так, у гэтых формах у назоўнікаў жаночага роду першага скланення, а ў месным склоне – у назоўнікаў мужчынскага роду

Репозиторий ВГУ

другога скланення не назіраецца чаргавання заднеязычных [г] // [з’], [к] // [ц], [х] // [с’]: *на наге, на руке, па шчаке, на ляхе, на парогу, у снягу, у кажуху* і інш. Адметна вымаўляюцца ненаціскныя канчаткі назоўнікаў першага і другога скланенняў з цвёрдай асновай у месным склоне: *у с’в’ец’і, у н’еб’і, у хац’і, у садз’і, у дом’і (у с’в’ец’ь, у н’еб’ь, у хац’ь, у садз’ь, у дом’ь)*; націскныя канчаткі назоўнікаў з мяккай асновай: *на з’амл’е, у с’ам’йэ, у пълынн’е* і інш.

У форме назоўнага склону мужчынскага роду адзіночнага ліку прыметнікі і абагульнена-якасныя займеннікі маюць канчаткі *-ый (-ій)*: *новый, добрый, малый, старый, звонк’ій, крас’івый, мъладый, так’ій, ус’ак’ій* і інш., а ў жаночым і ніякім родзе – канчаткі *-айа (-ъйа) і -ойа (-ьйа)*: *сырайа з’імл’а, новъйа хата, пустойа в’адро, дърагойа плац’ц’а*.

Характэрнай рысай гаворкі з’яўляецца тое, што ў трэцяй асобе адзіночнага ліку дзеясловы маюць канчатак на зычны *[ц’]* як у другім, так і ў першым спражэнні: *ідз’ец’, жыв’ец’, н’ъс’ец’, в’аз’ец’, гул’айіц’, чытайіц’, думайіц’, шыйіц’*. У трэцяй асобе множнага ліку дзеясловы першага і другога спражэнняў адрозніваюцца канчаткам толькі тады, калі ён знаходзіцца пад націскам: *в’азуц’, ідуц’ – гл’ідз’ац’, с’п’ац’*. Пры націску ж на аснове дзеясловы ў трэцяй асобе множнага ліку маюць толькі канчатак *-уц’*: *яны кос’уц’, ходз’уц’, воз’уц’, дз’ел’уц’*. У другой асобе множнага ліку дзеясловам абодвух спражэнняў уласцівы пад націскам канчатак *-іц’о (-ыц’о)*: *вы ідз’іц’о, с’ідз’іц’о, с’п’іц’о*. Ненаціскныя ж канчаткі дзеясловаў, як і назоўнікаў, вымаўляюцца невыразна: *вы ходз’іц’і, мыйіц’і (ходз’іц’ь, мыйіц’ь)*.

Гаворка жыхароў вёскі вызначаецца і шматлікімі адметнасцямі ў лексічным складзе. Найперш гэта цэлы шэраг слоў, характэрных для большасці паўночна-ўсходніх гаворак. Да іх адносяцца, напрыклад, словы *ажамеркі, адзежа, абуванне, баразна, буцян, вуцяк, кмін, курасадня, мятлік, сасоннік, стада, ставок, тапор* і інш. Акрамя агульных лексічных асаблівасцей, ёсць і адрозненні рэгіянальнага характару: *рахманка (іран.) – жанчына, якая стараецца ўсім дагадзіць, быць добрай для ўсіх; знесціся (неадабр.) – здружыцца; модна – нязвыкла; прыхажай – пра чалавека, якія ходзіць па хатах з мэтай што-небудзь пазычыць; пліндаўка – пра кароткае адзенне; брылеўнік – ліст лопуху; страбісаваць – страціць, патраціць дарэмна; паўцагелак – паўцагліны; гладка – зусім, пацяменькавацца – марудзіць* і інш.

У побытавым маўленні карэнных жыхароў вёскі адлюстроўваюцца шматлікія рысы рускай мовы, асабліва ў лексіцы. Гэта маўленне, якое можна назваць змешаным, ці трасянкай. Па азначэнні Л.У. Шчэрбы, “змешанае двухмоўе – гэта ўжыванне дзвюх моў уперамешку, іх змяшанне, іншымі словамі, узаемапранікненне” [2, 314-315]. Абумоўліваецца такая сітуацыя аб’ектыўнымі фактарамі, сярод якіх можна назваць тэрытарыяльнае суседства з Расіяй, паралельнае функцыянаванне дзвюх моў – рускай і беларускай – у розных сферах грамадскага жыцця, уплыў “калектыву” – тых людзей, якія жывуць побач, “прэстыжнасць” рускай мовы і інш. Калі ў самым агульным выглядзе прааналізаваць якасны склад розных тэматычных груп лексікі, можна заўважыць, што у кожнай адначасова прысутнічаюць словы і беларускай, і рускай моў, прычым у асобных выпадках словы рускай мовы колькасна нават пераважаюць. Параўн.: *агурцы, памідоры, буракі, бульба; зернавыя, жыта, ячмень, пшаніца; кофта, плацце, пальто, штаны, юбка; валасы, вочы, нос, губы; дождж, сонца, іней, граза, звёзды, пагода, жара; краваць, дзіван, кавёр, шкаф; ложка, вілка, нож, тарэлка, стакан, кружка; январ, февраль, март, апрэль, май, іюнь* і інш. Некаторыя словы беларускай і рускай моў функцыянуюць паралельна: *хустка –*

Репозиторий ВГУ

платок, маланка – молнія, рабіць – дзелаць, пахаваць – пахараніць, свята – праздник, страха – крыша, слоік – банка і інш.

Заключэнне. Прыведзеныя прыклады паказваюць, што гаворцы жыхароў в. Дзёрнавічы Верхнядзвінскага раёна ўласцівы шэраг спецыфічных асаблівасцей, якія характэрны для гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту і тут выяўляюцца у большай ці меншай ступені. Уважлівае і зацікаўленае вывучэнне такіх гаворак можа даць багаты матэрыял яшчэ не для адной лінгвістычнай працы.

Спіс літаратуры

1. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2012. – Ч. 1. – 304 с.
2. Щерба, Л.В. Языковая система и речевая деятельность / Л.В. Щерба. – Л., 1974. – 424 с.

ТЕОРИЯ ИНФОРМАЦИИ В ЯЗЫКОЗНАНИИ И ПРАКТИКЕ ОБЩЕНИЯ

А.Н. Деревяго
Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова

Язык является сложной и многомерной системой, внутреннее строение которой предопределяет разнообразие языковых функциональных реализаций. Традиционно первой и доминирующей ролью языка называется коммуникативная функция как способность создавать, передавать и хранить различную информацию. Эта функция реализуется при участии как минимум таких компонентов, как источник информации / адресант, получатель информации / адресат.

Цель данного исследования – определение сущности теории информации в структуре научного знания в целом и языкознания в частности, ее проявления в практике общения.

Материал и методы. Материал исследования – языковые знаки – поэтонимы, словесные товарные знаки, обладающие традиционными и особыми свойствами информативности, собранные посредством сплошной выборки в поэтическом тексте XX в., на официальных сайтах производителей www.by.kompass.com, www.local.by. Ведущим методом исследования является описательный как триединство приемов наблюдения, анализа и систематизации результатов.

В современной науке информация понимается как сведения о чем-либо, передаваемые устным, письменным или каким-нибудь другим способом, а также сам процесс передачи или получения этих сведений. В дальнейшем эта трактовка была расширена и включила обмен сведениями не только между людьми, но и между человеком и машиной, а также обмен сигналами в животном и растительном мире. Уточнения и ограничения данного интуитивного представления привели к естественнонаучному пониманию информации как фактора снятия неопределенности в результате получения сообщений, передаваемых по каналам связи [2]. В результате чего теория информации рассматривается как наука о статистических процессах передачи информации в технике, природных и социальных системах. Основные понятия этой теории (мера количества информации, пропускная способность канала связи, эффективность кодирование сообщений) были введены в 40-х гг. XX в. К. Шенноном [3]. Теория информации является по существу статистической теорией связи, или теорией передачи информации, однако общий характер её положений позволяет исследовать также процессы получения, обработ-

Репозиторий ВГУ